71.3(4Бел)
С 917
+3
Д99

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 008(476)(091)(043.3)+27-528.8(476)-9(043.3)

СУША
Аляксандр Аляксандравіч

# КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ГРЭКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ДЫХАТАМІІ “УСХОД – ЗАХАД”

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Мінск 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа выканана на кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Навуковы кіраўнік: **Смолік Аляксандр Іванавіч,** доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Афіцыйныя апаненты: **Гарбацкі Андрэй Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна"

**Траццяк Іван Іванавіч,** кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму ўстановы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы"

Апаніруючая арганізацыя: **Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт"**

Абарона адбудзецца 26 лістапада 2009 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. E-mail: buk@buk.by. Тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

Аўтарэферат разасланы 19 кастрычніка 2009 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт І.А. Смірнова

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Культурная спадчына мае выключнае значэнне для кожнага цывілізаванага народа, для ўзроўню яго самапавагі, гонару за ўласныя культурныя здабыткі і дасягненні. Ва ўмовах сучаснай дзяржаўнай сацыяльнай і культурнай палітыкі Беларусі праблема вывучэння і выкарыстання культурнай спадчыны з'яўляецца надзвычай актуальнай: распрацоўка праектаў і праграм сацыякультурнага развіцця патрабуе даследавання гісторыі, спадчыны, традыцый.

З распадам Савецкага Саюза і ўтварэннем суверэннай беларускай дзяржавы адбылася значная трансфармацыя рэлігійнага жыцця насельніцтва, што павысіла актуальнасць даследавання гісторыі асобных канфесій, іх ролі ў культурным развіцці беларускага грамадства. Паходжанне значнай часткі культурнай спадчыны Беларусі звязана з тымі ці іншымі галінамі хрысціянства. Кожная з іх унесла вялікі ўклад у развіццё беларускай культуры. Больш за чатырыста гадоў прайшло з таго часу, калі на беларускіх землях узнікла грэка-каталіцкая царква. Нягледзячы на яе шырокую распаўсюджанасць у XVII – пачатку XIX ст. і значнасць уплыву на тагачаснае беларускае грамадства, культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы дасюль не атрымала належнага навуковага асэнсавання, што павышае актуальнасць правядзення даследаванняў, прысвечаных яе ідэнтыфікацыі, уліку і вывучэнню.

Грэка-каталіцкая царква развівалася ва ўмовах узаемадзеяння ўсходніх і заходніх уплываў у айчыннай культуры. Адпаведна ў культурнай спадчыне грэка-каталіцкай царквы знайшлі адлюстраванне і ўсходнія (усходнееўрапейскія, усходнеславянскія, візантыйскія, праваслаўныя), і заходнія (заходнееўрапейскія, рыма-каталіцкія) традыцыі. Даследаванне гэтага феномена з'яўляецца актуальным ва ўмовах аналізу сучаснага стану і вызначэння перспектыўных напрамкаў сацыякультурнага развіцця Беларусі, узаемадзеяння, з аднаго боку, з заходнееўрапейскім светам, а з іншага з Расіяй і краінамі Азіі. Аналіз культурных сувязей Беларусі неабходны для фарміравання поўных і дакладных уяўленняў пра ролю і месца нашай краіны ў развіцці еўрапейскай і сусветнай цывілізацыі. Важным вынікам даследавання з'яўляецца навуковае абгрунтаванне эфектыўнасці выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў рэалізацыі асобных дзяржаўных праграм, патрыятычным выхаванні насельніцтва, фарміраванні ідэалогіі стабільнага і ўзважанага развіцця краіны, развіцці ўязнога і ўнутранага турызму.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Тэма дысертацыі звязана з прыярытэтным напрамкам фундаментальных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гады "Гісторыя культуры Беларусі, актуальныя праблемы яе сучаснага стану і перспектывы развіцця" (Пастанова Савета міністраў Рэспублікі Беларусь № 512 ад 17.05.2005 г.). Дысертацыя выканана ў рамках 5-гадовай (2006–2010 гг.) навукова-даследчай тэмы "Міжкультурная камунікацыя ў кантэксце глабалізацыйных працэсаў" кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Тэма



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ
БІБЛІЯТЭКА

дысертацыі зацверджана на пасяджэнні Савета УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 4 ад 20 снежня 2005 г.).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца выяўленне асаблівасцей фарміравання і выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў кантэксце дыхатаміі “Усход – Захад” у культуры Беларусі. Для дасягнення мэты даследавання ў дысертацыі ставяцца і вырашаюцца наступныя задачы:

- разгледзець феномен грэка-каталіцкай царквы як адзін з вынікаў сінтэзу ўсходніх і заходніх традыцый у развіцці беларускай культуры;
- выявіць асноўныя фактары, якія ўплывалі на захаванне ўсходняга пачатку і пашырэнне заходніх навацый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы;
- прасачыць асаблівасці ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх уплываў у працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы;
- акрэсліць прычыны знікнення вялікай часткі культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў XIX–XX стст. і вызначыць яе месца ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі;
- выявіць перспектыўныя напрамкі выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь.

**Аб’ектам даследавання** з’яўляецца культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі. **Прадметам** – працэс фарміравання і выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ва ўмовах ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх традыцый у сацыякультурным развіцці Беларусі. Выбар аб’екта і прадмета даследавання абумоўлены тым, што культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі дасюль не атрымала належнага вывучэння, а яе выкарыстанне на сучасным этапе сацыякультурнага развіцця Беларусі, хоць і мае значныя перспектывы, не можа лічыцца эфектыўным.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Развіццё беларускай культуры нязменна праходзіла ва ўмовах адначасовага ўплыву заходніх і ўсходніх фактараў (у сферы рэлігіі, мастацтва, палітыкі і інш.) без абсалютнага дамінавання тых ці іншых у канкрэтны перыяд. Дыхатамія “Усход – Захад” мела ў Беларусі характар міжкультурнага дыялогу, што абумовіла спецыфіку камунікацыйных працэсаў і паспрыяла фарміраванню самабытнага аблічча беларускай культуры, у якой заходнія і ўсходнія элементы зліліся ў непадзельнае адзінства.

Адным з вынікаў сінтэзу ўсходне- і заходнехрысціянскай традыцый у беларускай культуры з’яўляецца шэраг спроб паяднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Царкоўная унія і ўзнікненне грэка-каталіцкай царквы ў разуменні многіх айчынных дзяржаўных і царкоўных дзеячаў выступалі як сродак інтэграцыі заходніх ідэй і традыцый, якія прыйшлі з каталіцкай царквой, з традыцыямі і ідэямі ўсходнімі, найбольш паслядоўным захавальнікам і праваднікам якіх выступала праваслаўная царква.



2. Асаблівасцю культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі на працягу ўсяго перыяду яе існавання з’яўлялася пастаянная апора на дзве традыцыі – усходнюю і заходнюю. Грэка-каталіцкая царква шырока выкарыстоўвала культурную спадчыну праваслаўнай царквы ВКЛ, адстойвала права на захаванне ўсходнехрысціянскіх абрадаў і догматаў, падтрымлівала культурныя сувязі з Расіяй і іншымі праваслаўнымі краінамі, актыўна выкарыстоўвала працу творцаў з гэтых рэгіёнаў. Захаванню ўсходняга пачатку культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы на апошнім этапе яе існавання спрыяла адпаведная дзяржаўная падтрымка.

Інтэнсіфікацыі заходняга ўздзеяння на культуратворчы працэс у грэка-каталіцкім асяроддзі спрыяла больш актыўнае пасля царкоўных сабораў у Брэсце (1596) і Замосці (1720) узаемадзеянне з заходнехрысціянскімі краінамі, каталіцкімі манаскімі ордэнамі, запрашэнне заходнееўрапейскіх майстроў, пашырэнне выкарыстання польскай і лацінскай моў, павелічэнне цікавасці да еўрапейскай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, распаўсюджанне барочных уплываў на ўсё культурнае жыццё Беларусі азначанага перыяду. У выніку грэка-каталіцкая царква не толькі ўзбагаціла сваю культуратворчую дзейнасць за кошт кантактаў з Захадам, але і стала паўнацэнным удзельнікам еўрапейскага культурнага жыцця.

3. Адметнасцю фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі было свядомае і асэнсаванае выкарыстанне царквой заходніх і ўсходніх навацый: новыя ідэі, каштоўнасці, тэхналогіі прыжываліся толькі пасля праходжання працяглага працэсу свядомага выбару, адаптацыі і трансфармацыі ў адпаведнасці з мясцовай традыцыяй. Суадносіны выкарыстання ўсходніх і заходніх традыцый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы не былі нязменнымі. Яны вагаліся ў залежнасці ад гістарычнага перыяду, характару асяродка культуратворчай дзейнасці (манастыр, царква ці адукацыйная ўстанова, горад ці вёска і інш.) і пазіцыі творцаў. У выніку сінтэзу традыцый Усходу і Захаду культуратворчая дзейнасць у грэка-каталіцкім асяроддзі суправаджалася стварэннем новых форм, што абумовіла самабытны і непаўторны характар культурнай спадчыны.

4. Асноўнай прычынай страты значнай часткі культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы было знікненне самой царквы (суб’екта традыцыі, асяродка бытавання) і немагчымасць поўнай інтэграцыі гэтай спадчыны ў сістэму каштоўнасцей і сферу функцыянальнага ўжытку новых уладальнікаў, што было выклікана неўласцівым ім узроўнем сінтэзу традыцый Усходу і Захаду. Значна меншую ролю ў знішчэнні адыгралі пажары, паводкі, ваенныя дзеянні, вываз культурных каштоўнасцей за мяжу і іншыя прычыны. Вялікая колькасць помнікаў мастацкай культуры грэка-каталіцкай царквы сёння належыць (часта ў трансфармаваным выглядзе) праваслаўнай і каталіцкай цэрквам, магчымасць чаго забяспечана блізкасцю гэтай спадчыны як да ўсходняй, так і да заходняй хрысціянскіх традыцый. На сучасным этапе выкарыстанне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы не можа быць прызнана эфектыўным.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Перспектывы выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы звязаны з вырашэннем ідэолага-палітычных, выхаваўчых і эканамічных задач. Ва ўмовах актуалізацыі праблем глабалізацыі яна пацвярджае здольнасць беларускай культуры да захавання ўласнага аблічча, сваіх характэрных рыс, што з'яўляецца доказам высокага ўзроўню яе развіцця. З іншага боку, яна дэманструе даўнасць культурных сувязей Беларусі як з заходнім, так і ўсходнім хрысціянскім светам, з краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы. Утвараючы значную і самабытную частку культурных каштоўнасцей Беларусі, культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы можа быць выкарыстана ў справе патрыятычнага выхавання моладзі, развіваць пачуццё гонару за багацце і непаўторнасць нацыянальнай культуры.

У сучасных умовах, калі культурныя рэсурсы (спадчына) становяцца адным з асноўных тавараў ці прадуктаў, разумнае выкарыстанне якіх дазваляе ўнесці істотны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, Рэспубліка Беларусь павінна больш рацыянальна выкарыстоўваць культурную спадчыну грэка-каталіцкай царквы. Апошняя з'яўляецца каштоўным рэсурсам для развіцця нацыянальнага турызму, а таксама рэалізацыі шэрагу сацыяльных і культурных дзяржаўных праграм. Павышэнне эфектыўнасці выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы звязана з вырашэннем праблем яе сістэмнай ідэнтыфікацыі, уліку, захавання (кансервацыі), даследавання і папулярызацыі.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Даследаванне было праведзена суіскальнікам самастойна на ўсіх этапах падрыхтоўкі дысертацыі. У выніку ўпершыню праведзена комплекснае вывучэнне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў зрэзе адначасовага ўздзеяння на яе ўсходніх і заходніх фактараў. У рабоце выяўлены асноўныя заканамернасці характару захавання ўсходнехрысціянскіх традыцый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы пры адначасовым яе насычэнні заходнімі элементамі. Абгрунтавана абумоўленасць фарміравання і выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы спецыфікай развіцця культуры Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад". У час правядзення даследавання былі выяўлены і апісаны асобныя помнікі, створаныя прадстаўнікамі грэка-каталіцкай царквы, уведзены ў навуковы абарот новыя архіўныя крыніцы, а таксама малавядомыя навуковай грамадскасці айчынныя і замежныя навуковыя даследаванні. Сфармуляваны канкрэтныя шляхі выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ва ўмовах сучаснага сацыякультурнага развіцця Беларусі. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі дысертацыі, напісаны без сааўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены на 37 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: XXVIII канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ культуры (Мінск, 2003); IX міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні (Мінск, 2003); "Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры" (Мінск, 2004); "Мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім і краінах сучаснай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: традыцыі і пераемнасць" (Брэст, 2004); "Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся" (Гомель, 2004); "Человек. Культура. Общество" (Мінск, 2004); X міжнародныя навуковыя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні (Мінск, 2004); IX республиканская научная конференция студентов и аспирантов Республики Беларусь (Гродна, 2004); "Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность" (Мінск, 2004); "Романовские чтения", (Магілёў, 2004); "Личность в истории: героическое и трагическое" (Брэст, 2004); "Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць" (Полацк, 2004); III семінар студэнтаў ВНУ Беларусі, прысвечаны 195-годдзю з дня нараджэння М.В. Гогаля (Жыровічы, 2004); "Содружество наук. Барановичи-2005" (Баранавічы, 2005); II Няфёдаўскія чытанні (Мінск, 2005); "Национально-культурный компонент в тексте и языке" (Мінск, 2005); "Каштоўнасці нацыянальнай культуры і грамадзянска-палітычнае выхаванне студэнцкай моладзі" (Мінск, 2004); "Вялікая Перамога: гераізм і подзвіг народаў" (Мінск, 2005); "Вялікая Перамога!" (Мінск, 2005); XI Міжнародныя навуковыя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні (Мінск, 2005); "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" (Мінск, 2005); "Этнасацыяльныя і канфесійныя працэсы ў сучасным грамадстве" (Гродна, 2005); "Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры" (Мінск, 2006); "Религия и общество: актуальные проблемы современного религиоведения" (Магілёў, 2006); "Леў Сапега (1557–1633) і яго час" (Гродна, 2007); "Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья" (Віцебск, 2007); "Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа" (Гродна, 2007); "Библиотеки в информационном пространстве: синтез традиций и инноваций" (Мінск, 2007); "Книжная культура пограничья Славии Восточной и Западной" (Масква, 2007); "Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы" (Мінск, 2008); "Проблемы и пути внедрения военно-научной работы курсантов в учебный процесс" (Мінск, 2008); IX Кирилло-Мефодиевские Чтения "Два града культуры. Метаисторическое и конкретно-историческое в культурном развитии" (Санкт-Пецярбург, 2008); "Белорусский текст: от рукописи к электронной книге" (Масква, 2008); IV Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні "Новыя тэхналогіі ў захаванні дакументальнай спадчыны" (Мінск, 2008); "Книга – источник культуры. Проблемы и методы исследования" (Мінск, 2008); "Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа" (Гродна, 2009), "Dziedzictwo kulturowe Wielkiego Księstwa Litewskiego" (Люблін, 2009), "Славянское книгопечатание и культура книги" (Мінск, 2009).

Новыя матэрыялы, уведзеныя ў навуковы ўжытак, зробленыя ў даследаванні тэарэтычныя вывады і назіранні апрабіраваны ў лекцыйных курсах у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, у Дзяржаўным агульнаадукацыйным ліцэі г. Лунінца, сярэдняй агульнаадукацыйнай школе № 5 Светлагорска, а таксама ў працэсе навуковага апісання старадрукаваных выданняў і рукапісаў і пры падрыхтоўцы выставак у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (4 акты аб укараненні).

**Апублікаванасць вынікаў**

Асноўныя вынікі даследавання па тэме дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў 38 публікацыях, сярод якіх 1 навуковая брашура (2,4 аўт. арк.), 6 артыкулаў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэцэнзаваных навуковых часопісах і зборніках (7,5 аўт. арк.), 8 публікацый у навуковых зборніках, 23 у зборніках матэрыялаў і тэзісаў навукова-практычных канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаванага матэрыялу – 24,9 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу. Агульны аб'ём дысертацыі складае 158 старонак, з якіх 112 старонак займае асноўны тэкст, 46 – бібліяграфічны спіс, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (498 найменняў на беларускай, рускай, украінскай, старабеларускай, царкоўнаславянскай, польскай, англійскай, італьянскай, літоўскай і лацінскай мовах) і спіс публікацый суіскальніка (38 найменняў на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць, вызначаюцца мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання; фармулююцца палажэнні, якія выносяцца на абарону; адлюстроўваецца апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць і аб'ём публікацый суіскальніка, структура і аб'ём дысертацыі.

**Глава 1 *"Тэарэтычныя і метадалагічныя асновы вывучэння культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад""*** уключае агляд літаратуры па тэме, ацэнку распрацаванасці праблемы, абгрунтаванне тэарэтыка-метадалагічных прынцыпаў даследавання, характарыстыку сацыядынамікі беларускай культуры ва ўмовах ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх фактараў, а таксама абгрунтаванне ўзнікнення грэка-каталіцкай царквы як выніку сінтэзу ўсходніх і заходніх уплываў у культуры Беларусі.

У раздзеле 1.1 *"Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў навуковай літаратуры XVIII–XXI стст."* аналізуюцца навуковыя публікацыі, прысвечаныя культурнай спадчыне грэка-каталіцкай царквы. Адпаведныя навуковыя даследаванні пачаліся ў XVIII ст. у асяроддзі самой грэка-каталіцкай царквы (І. Кульчынскі, І. Сцябельскі і інш.). Культурная спадчына царквы была адзначана ў работах апісальнага характару расійскіх навукоўцаў, падарожнікаў і вайскоўцаў канца XVIII – пачатку XIX ст. На працягу XIX ст. апрача вялікай колькасці палемічных і агітацыйных работ выходзілі таксама выданні навуковага характару, сярод якіх заслугоўваюць увагі публікацыі І. Сямашкі, В. Лужынскага, М.В. Каяловіча, К.А. Гаворскага, Р.Я. Кіпрыяновіча і інш. У XIX – пачатку XX ст. у заходніх губернях Расійскай імперыі была распачата актыўная археаграфічная дзейнасць, вынікам якой стала публікацыя шматлікіх крыніц, звязаных з гісторыяй грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі.

Вялікую ўвагу культурнай сферы ў дзейнасці грэка-каталіцкай царквы надавалі дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння першай трэці XX ст., якія ўпершыню ў адпаведнасці са спецыфікай культурнага жыцця Беларусі (а не Польшчы ці Расіі) далі ацэнку культурных здабыткаў, якія пакінула грэка-каталіцкая царква. У 1930–70-я гг. на хвалі барацьбы з рэлігіяй савецкая навука прыйшла да пазіцыі свядомага замоўчвання ці жорсткай дыскрэдытацыі ўсіх сфер дзейнасці грэка-каталіцкай царквы (Л.С. Абецадарскі, В.Ф. Гапановіч, Л.А. Царанкоў і інш.). У другой палове 1980-х гг. адбылося значнае абуджэнне навуковага вывучэння мінулага Беларусі, у выніку чаго нярэдка закраналася і культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы (публікацыі Э.І. Вецер, Т.В. Габрусь, Г.Я. Галенчанкі, В.У. Дадзіёмавай, Э.К. Дарашэвіча, Ю.А. Лабынцава, А.І. Мальдзіса, У.Г. Кароткага, І.І. Крамко, А.М. Кулагіна, А.К. Лявонавай, І.Д. Назінай, С.А. Падокшына і інш.). Глыбокае навуковае асэнсаванне дынамікі культурных працэсаў у Беларусі і месца ў іх культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы стала магчымым у канцы XX – пачатку XXI ст. (работы Т.В. Габрусь, А.М. Кулагіна, Ю.А. Лабынцава, Т.У. Ліхач, С.В. Марозавай, А. Навумава, С.А. Падокшына, В.Р. Пуцко, Л.Ф. Самусіка, М. Цубжыньскай-Леанарчык, В.Ф. Шматава, Л.Л. Шчавінскай і інш.). Тым не менш і сёння не існуе грунтоўнага культуралагічнага даследавання працэсаў, якія ўплывалі на культуратворчую дзейнасць грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі. У большасці работ закранаюцца толькі асобныя аспекты дадзенай праблемы, не робіцца акцэнт на магчымасцях выкарыстання спадчыны на сучасным этапе сацыякультурнага развіцця Беларусі.

У раздзеле 1.2 *"Агульныя тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы даследавання праблемы "Усход – Захад""* разглядаюцца метадалагічныя напрацоўкі сусветнай і беларускай навукі ў сферы вывучэння міжкультурнага і міжцывілізацыйнага ўзаемадзеяння ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад".

Яшчэ з XVIII ст. існавала вялікая разнастайнасць поглядаў на праблему "Усход – Захад": ад каланіялісцкіх да гуманістычных. У XIX – пачатку XX ст. суіснавалі канцэпцыі супрацьлегласці, несумяшчальнасці культур Захаду і Усходу (М.Я. Данілеўскі, О. Шпенглер і інш.) і неабходнасці творчага ўзаемадзеяння культур (П.Я. Чаадаеў, У.С. Салаўёў, М.І. Карэеў і інш.). У XX ст., калі развівалася міжнароднае супрацоўніцтва і актывізаваліся працэсы глабалізацыі і уніфікацыі культур, пераважная большасць даследчыкаў перайшла на пазіцыі неабходнасці міжкультурнага дыялогу. Значнымі з'явамі сталі распрацоўка прынцыпаў існавання цывілізацый, іх узнікнення, росту, узаемадзеяння і пагібелі (А. Тойнбі, Ф. Фукуяма, З. Бжэзінскі, С. Ханцінгтон і інш.), адыход ад класічнага пастулата XIX ст. аб катэгарычным раздзяленні культуры і цывілізацыі (А.Л. Кробер, К. Клакхан, Ф. Брадэль і інш.), абгрунтаванне прынцыпаў узаемадзеяння культур, іх дыялогу (Ф. Шлеермахер, В. Дзільтэй, Г. Рыкерт, М. Бубер, М.М. Бахцін, У.С. Біблер, Л.М. Баткін і інш.). Істотны ўклад у вывучэнне праблематыкі кантактаў культур Усходу і Захаду зрабілі расійскія і савецкія аўтары: браты Весялоўскія, С.Ф. Альдэнбург, В.М. Аляксееў, Т.П. Грыгор'ева, А.У. Іваноў, М.С. Каган, М.І. Конрад, А.Г. Хілтухіна, В.К. Чалаян і інш. М.С. Каган падрабязна разгледзеў магчымасці выкарыстання для даследавання праблемы "Усход – Захад" асноўных прынцыпаў сістэмнага, гістарычнага і сінергетычнага падыходаў.

Праблема ўзаемадачыненняў Усходу і Захаду ў беларускай культуры стала актуальнай досыць даўно. Яе разумелі і спрабавалі вырашыць культурныя і грамадскія дзеячы Полацкага і Тураўскага княстваў (Усяслаў Чарадзей, князь



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яраполк, Кірыла Тураўскі і інш.), ВКЛ (мітрапаліты К. і Р. Цамблакі, Герасім, Рыгор Балгарын, Місаіл, многія вялікія князі, Ф. Скарына і інш.), Рэчы Паспалітай (Л. Сапега, П. Скарга, К. Астрожскі, І. Пацей, М. Сматрыцкі і інш.). У XIX – пачатку XX ст. адны аўтары адносілі беларускую культуру да ўсходняга арэала (І. Сямашка, М. Каяловіч, К. Гаворскі, Г. Кіпрыяновіч і інш.), іншыя абгрунтоўвалі еўрапейскі характар беларускай культуры (А. Міцкевіч, І. Даніловіч, Т. Нарбут і інш.). Асобныя аўтары адстойвалі ўласны шлях для беларускай культуры (М. Баброўскі, К. Каліноўскі, Я. Купала, І. Абдзіраловіч і інш.). У часы існавання Савецкага Саюза ва ўмовах знешняй пагрозы з Захаду і праследавання "заходнікаў" спрадвечная варожасць Захаду ўжо лічылася неабвержнай, таму да пытання "Усход – Захад" айчынныя даследчыкі звярталіся рэдка і як да вырашанага пытання.

Усплёск цікавасці да праблемы назіраецца на працягу апошніх дваццаці гадоў. Аналіз геапалітычнага становішча Беларусі, пошук уласнага месца ў свеце дазволілі пераважнай большасці сучасных айчынных даследчыкаў схіліцца да думкі пра балансаванне беларускай культуры на мяжы ўсходніх і заходніх уплываў. Можна вылучыць пяць асноўных падыходаў да праблемы "Усход – Захад" у дачыненні да беларускай культуры: 1. Беларусь між Еўропай і Азіяй; 2. Беларусь на памежжы Усходу і Захаду хрысціянства/славянскага свету/Еўропы; 3. Беларусь між Расіяй і Польшчай; 4. Беларусь між Расіяй і Еўрапейскім Саюзам/НАТО; 5. Усход і Захад Беларусі. Для беларусазнаўства наогул і для дадзенага даследавання ў прыватнасці найбольшую цікавасць уяўляюць другі і трэці падыходы. Пры гэтым падзел "Усход – Захад" праводзіцца не па геаграфічнаму ці эканамічнаму крытэрыям. Значэнне мае культурная дыферэнцыяцыя, вылучэнне "культурнага Усходу" і "культурнага Захаду".

У раздзеле 1.3 *"Сацыядынаміка беларускай культуры ва ўмовах узаемадзеяння ўсходніх і заходніх фактараў"* праводзіцца аналіз гістарычнага развіцця айчыннай культуры на сумежжы ўздзеяння ўсходніх і заходніх уплываў.

Аналіз гісторыка-культурнага развіцця Беларусі сведчыць пра інтэнсіўнасць кантактаў айчыннай культуры як з Захадам, так і з Усходам, незалежна ад уваходжання беларускіх зямель у склад таго ці іншага дзяржаўнага фарміравання, часовых палітычных і эканамічных прыярытэтаў. Дыхатамія "Усход – Захад" у беларускай культуры выразілася ў форме дыялогу руска-візантыйскай і рамана-лацінскай, заходне- і ўсходнееўрапейскай, заходне- і ўсходнехрысціянскай культур і цывілізацый. У гісторыі айчыннай культуры мелі месца і іншыя тыпы міжкультурнай камунікацыі: дыфузія (узаемапранікненне), інтэграцыя (узаемадапаўненне), асіміляцыя (прыпадабненне), экспансія (навязванне) і інш. Аднак менавіта дыялог (з патрабаваннямі паразумення, суперажывання, эмпатыі, прызнання унікальнасці кожнага суб'екта) стаў адным з найбольш характэрных і тыповых для культуры Беларусі.

Памежнае ў культурным плане становішча дазволіла Беларусі захаваць уласную ідэнтычнасць, не зважаючы на пастаянныя спробы іншых дзяржаў і народаў уключыць беларускую культуру ў свой арэал. Характар узаемадзеяння заходніх і ўсходніх уплываў мяняўся ў гістарычнай дынаміцы, не ствараючы пры гэтым перыядаў поўнага дамінавання тых ці іншых. Рознавектарныя ўплывы не



толькі прысутнічалі ў айчыннай культуры, але творча ўзаемадзейнічалі і вялі да стварэння багатай і самабытнай культурнай спадчыны, адметнай як ад усходняй рускай, так і ад заходняй польскай. Унікальны гістарычны вопыт творчага ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх культурных традыцый у Беларусі выглядае сёння вельмі каштоўным ва ўмовах міжкультурнага дыялогу ў усёахопнай глабалізацыі.

У раздзеле 1.4 *"Грэка-каталіцтва як праява сінтэзу ўсходніх і заходніх уплываў у культуры Беларусі"* абгрунтавана абумоўленасць узнікнення ў Беларусі грэка-каталіцкай царквы папярэднім гісторыка-культурным развіццём, узаемадзеяннем усходніх і заходніх традыцый у беларускай культуры.

Праблема царкоўнай уніі, якая ўзнікла не ў Беларусі, для беларускага культурнага арэала і некаторых іншых рэгіёнаў Еўропы мела вельмі вялікае значэнне, бо рэлігійны кантэкст у найбольшай ступені вызначаў у Беларусі характар дыхатаміі "Усход – Захад". Існавалі ў Беларусі і іншыя формы ўзаемадзеяння культур у сферы рэлігійнага жыцця: ад мірнага суіснавання да ўзброенага супрацьстаяння. Аднак наяўнасць у царкоўнай гісторыі беларуска-ўкраінскага рэгіёна вялікай колькасці спроб заключыць саюз (унію) паміж рознымі канфесіямі вызначае гэту з'яву як характэрную для названага рэгіёна. Прычын таму некалькі: працяглае суіснаванне і ўзаемадзеянне ў Беларусі дзвюх хрысціянскіх традыцый; надзеі дзяржаўнага і царкоўнага кіраўніцтва на кансалідацыю грамадства ў выніку саюзу цэркваў; крах Візантыі як рэлігійнага цэнтра, падпарадкаванне канстанцінопальскіх патрыярхаў турэцкім султанам, што выклікала неабходнасць пошукаў новай аўтарытэтнай духоўнай улады.

Ідэя царкоўнай уніі з'явілася ў асяроддзі праваслаўнай іерархіі ў Беларусі ў канцы XIV ст. і працягвала заставацца актуальнай да Брэсцкага сабора 1596 г. Яе важнасць бачная з таго факта, што амаль усе беларуска-ўкраінскія праваслаўныя мітрапаліты XV ст. ставіліся да яе станоўча і рабілі захады па яе рэалізацыі. Гэта ідэя была блізкай і многім свецкім асобам, абмяркоўвалася ў беларускім грамадстве (погляды Ф. Скарыны). Зніжэнне інтэнсіўнасці спроб заключыць царкоўную унію ў сярэдзіне XVI ст., выкліканае хуткім распаўсюджаннем пратэстантызму, змянілася ўзрастаннем інтарэсу да праблемы ў апошняй трэці XVI ст. Свае праекты царкоўнай уніі прапаноўвалі каталіцкія (Б. Гербест, П. Скарга і інш.) і праваслаўныя царкоўныя іерархі (І. Пацей, К. Цярлецкі і інш.), грамадскія і дзяржаўныя дзеячы (К. Астрожскі, Л. Сапега і інш.). У 1596 г. быў рэалізаваны праект праваслаўных епіскапаў, які прадугледжваў падпарадкаванне Рыму пры захаванні ўсходняй абраднасці і царкоўных традыцый. Брэсцкая унія ўяўляла сабой не рэзкую і нечаканую рэвалюцыю ў рэлігійным жыцці, а складаную рэформу, якая выношвалася і распрацоўвалася на працягу стагоддзяў. Тэрмін "грэка-каталіцкая царква" ў Беларусі азначае пэўны перыяд існавання ўсходняй хрысціянскай царквы (ці яе часткі) ад рэформы перападпарадкавання ад канстанцінопальскага патрыярха папе рымскаму ў 1596 г. да рэформ злучэння з праваслаўнай царквой Расіі ў 1830-я гг. Узнікненне грэка-каталіцкай царквы, абумоўленае суіснаваннем у беларускай культуры заходняй і ўсходняй хрысціянскіх традыцый, выклікала яшчэ больш іх узаемаўплыў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Глава 2 *“Фарміраванне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў кантэксце дыялогу "Усход – Захад"”*** прысвечана даследаванню характару захавання ўсходнехрысціянскіх традыцый, распаўсюджання традыцый заходняга свету і іх узаемадзеянню ў культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы, адным з вынікаў якога стаў сінтэз традыцый Усходу і Захаду і фарміраванне багатай і самабытнай культурнай спадчыны.

У раздзеле 2.1 *“Захаванне і развіццё ўсходняга пачатку ў культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы”* разглядаецца роля ўсходніх (у першую чаргу, усходнехрысціянскіх) традыцый у працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы. Пытанне пра неабходнасць захавання ўласнага аблічча было пастаўлена кіраўніцтвам царквы яшчэ на этапе абмеркавання ўмоў уніі, што было зафіксавана ў так званых 33 артыкулах. Паколькі грэка-каталіцкая царква ў Беларусі ўзнікла на аснове праваслаўнай, яна не мела патрэбы ў стварэнні з самага пачатку ўласных культурных традыцый, узораў, арыенціраў: не перапісваліся нанова абразы, не перабудоўваліся храмы, а выкарыстоўваліся ранейшыя. Аналіз шырокага кола крыніц паказвае, што пераважная большасць праваслаўных ікон, многія помнікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кніжныя помнікі XV–XVI стст. у пазнейшы перыяд захоўваліся ў грэка-каталіцкіх храмах і манастырах. У падмурак культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы легла праваслаўная багаслоўска-філасофская думка, адукацыйная сістэма, богаслужбовая і музычная практыка і інш. Паказальным з’яўляецца факт зберагання ў грэка-каталіцкіх цэрквах ікон маскоўскага пісьма, расійскіх кніг, іншых прадметаў расійскага паходжання, а таксама помнікаў з іншых рэгіёнаў хрысціянскага і славянскага Усходу. Падтрыманню ўсходніх традыцый спрыяла праца ў Беларусі многіх майстроў, грамадскіх і культурных дзеячаў, якія паходзілі з іншых краін, дзе быў распаўсюджаны ўсходні варыянт хрысціянства.

Найлепш усходняя традыцыя захавалася ў сферы царкоўнай абраднасці, што ўплывала на іншыя сферы (напрыклад, на музычнае мастацтва), вызначала агульны характар культурнай спадчыны. Узровень захавання ўсходніх традыцый залежаў ад сацыяльнага слоя носьбітаў культуры: пераважную большасць прыхаджан грэка-каталіцкай царквы складала сялянства і дробная шляхта, якія заўжды адзначаліся кансерватызмам і ў найменшай ступені паддаваліся працэсам паланізацыі; асяроддзе белага духавенства ў адрозненне ад грэка-каталіцкага манаства таксама прытрымлівалася ўсходніх традыцый і супрацьдзейнічала лацінізацыі царквы.

Палітыка збліжэння грэка-каталіцкай царквы з праваслаўнай, якая мела месца пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі, спыніла адыход ад усходніх традыцый, які сапраўды намеціўся раней ва ўсёй беларускай культуры. Аднак у грэка-каталіцкім асяроддзі не назіралася масавай падтрымкі праўсходніх ініцыятыў расійскіх улад, бо царква не магла пераарыентавацца выключна на ўсходнія ўзоры культуратворчай дзейнасці. Пацвярджэннем жывасці ўсходняй традыцыі ў культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы з’яўляецца тое, што асноўная частка яе культурнай спадчыны пасля ліквідацыі уніі перайшла ва ўласнасць праваслаўнай царквы Расійскай імперыі і працягвала выкарыстоўвацца.



У раздзеле 2.2 *“Уздзеянне заходніх фактараў на працэсы фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы”* аналізуюцца асноўныя рысы працэсу пранікнення і пашырэння заходніх традыцый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы. Арыентацыя на традыцыі заходняга свету не была выклікана падзеямі 1596 г. Наадварот, спрадвечная сувязь культурнага развіцця Беларусі з культурай Захаду забяспечыла саму магчымасць узнікнення грэка-каталіцкай царквы. Аднак калі да Брэсцкай уніі заходнія навацыі прыжываліся ў праваслаўным асяроддзі павольна і часцей несвядома, без тэарэтычнага асэнсавання і абмеркавання, то грэка-каталіцкая царква свядома пайшла шляхам выкарыстання ў сваёй дзейнасці нароўні з усходнімі заходніх традыцый. Грэка-каталіцкая царква адважылася нават на змену некаторых элементаў дагматыкі, што выклікала яшчэ большую вольнасць у звароце да заходняй традыцыі. Аналіз культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы яскрава паказвае наколькі блізкім было інтэлектуальнае жыццё Беларусі і заходніх краін. У прыватнасці, на Беларусі распаўсюджваліся і развіваліся многія заходнія па паходжанні навуковыя тэорыі і ідэі, былі добра вядомы імёны і працы заходнееўрапейскіх філасофаў і багасловаў.

Агульны аб’ём заходніх запазычанняў пастаянна і даволі размерана павялічваўся ад 1596 г. да 1830-х гг. Шматлікія заходнія новаўвядзенні былі атрыманы грэка-каталіцкай царквой пры яе ўзнікненні праз пасрэдніцтва праваслаўнай царквы ВКЛ. Так, у сакральным выяўленчым мастацтве грэка-каталіцкай царквы атрымаў развіццё пачаты ў XVI ст. у мастацкай культуры праваслаўя Беларусі паварот да рэчаіснасці, натуральнасці, адбылося збліжэнне са свецкай культурай, уведзена псіхалагічная характарыстыка персанажаў, большае значэнне набыла лінейная перспектыва. З сярэдзіны XVII ст. грэка-каталіцкая царква ў сваёй культуратворчай дзейнасці павялічыла разрыў з праваслаўем ВКЛ (выкарыстанне музычных інструментаў і інш.). Гэта тлумачыцца не толькі актыўным развіццём грэка-каталіцкай царквы ў напрамку заходніх культурных узораў, але і паступовым падпарадкаваннем праваслаўнай царквы ў Беларусі маскоўскім патрыярхам, а пазней расійскаму сіноду, у выніку чаго яна адышла ад традыцый актыўнага ўзаемадзеяння з заходняй культурай. Інтэнсіфікацыя кантактаў з Захадам мела месца пасля Замойскага сабора 1720 г., які легалізаваў многія заходнія навацыі. У другой палове XVIII ст. грэка-каталіцкая царква пачала выступаць наватарам у традыцыйных для заходнееўрапейскай культуры стылістычных напрамках, стварэць яркія і самабытныя помнікі ў рамках заходняй традыцыі. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі значна ўзмацніўся заходні (у першую чаргу, польскі) уплыў на працэс фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы, што было спынена рэформамі 1830-х гг.

Заходняе ўздзеянне на культуратворчыя працэсы ў грэка-каталіцкім асяроддзі мела паўсюдны характар: фактычна ўсе сферы культурнага жыцця трапілі пад яго ўплыў, нават такія кансерватыўныя, як абраднасць. Характэрна, што заходнія навацыі прыжываліся на беларускай глебе нашмат лепш, чым у суседняй Украіне, дзе таксама існавала грэка-каталіцкая царква (больш хуткае прыняцце уніі, пашырэнне практыкі выкарыстання арганаў і інш.). У адрозненне ад Украіны ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі большая ці меншая ступень вестэрнізацыі культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы амаль не залежала ад геаграфічнага фактару. Значнымі фактарамі заходняга ўплыву на фарміраванне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы з'яўляюцца запрашэнне з Захаду майстроў, праца многіх беларускіх культурных дзеячаў у краінах Заходняй Еўропы, дарэнне помнікаў культуры мецэнатамі-католікамі або атрыманне іх з-за мяжы, узаемадзеянне з членамі каталіцкіх манаскіх ордэнаў (найперш, босых кармелітаў і езуітаў) і інш.

Заходнія навацыі не бяздумна запазычваліся грэка-каталіцкай царквой, а праходзілі творчую перапрацоўку ў адпаведнасці з мясцовымі традыцыямі. Даследчыкі адзначаюць, што ў культурна-рэлігійных кантактах Беларусі з Усходам і Захадам ніколі не было механічных перайманняў, простай "трансплантацыі", пасіўнага наследавання чужых узораў.

Раздзел 2.3 *"Сінтэз усходніх і заходніх традыцый у фарміраванні культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы"* прысвечаны вывучэнню адной з найбольш крэатыўных форм узаемадзеяння ўсходніх і заходніх уплываў у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы. Сінтэз каштоўнасцей розных культур меў месца на беларускіх землях задоўга да ўзнікнення грэка-каталіцкай царквы, аднак яна здолела найбольш ярка праявіць сябе ў справе паяднання грэка-візантыйскай і рымска-каталіцкай культур.

Беларускі епіскапат яшчэ да заключэння Брэсцкай уніі 1596 г. адмовіўся прыняць праграму каталіцкіх багасловаў (Б. Гербеста, П. Скаргі і інш.), бо яна прапаноўвала адмовіцца ад большасці ўсходніх і мясцовых царкоўных традыцый (дагматычных, абрадавых, моўных і інш.). З іншага боку, неабходнасць паяднання цэркваў вымушала пайсці на прызнанне некаторых навацый заходняга характару. Такім чынам, беларускі епіскапат пайшоў шляхам кампрамісу, спалучэння асобных элементаў розных культур і светапоглядных арыентацый, што выразілася ў добра вядомых 33 артыкулах. Ужо асобныя палажэнні гэтага дакумента мелі сінтэтычны характар: кампрамісны варыянт сімвала веры, прыняцце прычасця пад двума відамі (кваснага і прэснага хлеба) і інш. У далейшым адбываліся дыфузія і сінтэз у тых сферах, якія першапачаткова захоўвалі сваю ўсходнюю ці заходнюю форму (непасрэднае падпарадкаванне папе рымскаму, вучэнне пра чысцец, абраднасць).

Узаемадачыненні ўсходняга і заходняга пачаткаў у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі мелі розныя формы: ад варожага супрацьстаяння і дамінавання аднаго пачатку над другім да суіснавання і дыялогу. Форма культурнага сінтэзу гэтых пачаткаў дазволіла стварыць нешта новае, адрознае ад тых помнікаў культуры, што ўзнікалі ў межах асобна ўсходняй ці заходняй традыцый. Творчы сінтэз назіраўся на працягу ўсяго перыяду існавання грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі. У канцы XVI – пачатку XVII ст. грэка-каталіцкая царква працягвала традыцыі сінтэзу ўслед за праваслаўнай царквой ВКЛ. У другой палове XVII–XVIII ст. назіралася пашырэнне ў Беларусі новага еўрапейскага стылю барока, які быў творча перапрацаваны на мясцовай глебе, увабраў у сябе многія мясцовыя і ўсходнія асаблівасці ("віленскае барока"). Вынікам сінтэзу ўсходняга і заходняга пачаткаў у грэка-каталіцкай мастацкай



культуры ў XVIII ст. сталі дэміфалагізацыя сакральных вобразаў, фальклурызацыя мастацтва, сумяшчэнне рэалістычнасці выканання твораў з яркасцю, экспрэсіўнасцю і глыбокай натхнёнасцю вобразаў. Нават пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі не адбылося рэзкай пераарыентацыі на ўсходнія мадэлі, а мела месца абвастрэнне і супрацьпастаўленне ўсходніх і заходніх тэндэнцый у рамках культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы: царква ў гэты перыяд зведала найбольшую паланізацыю і лацінізацыю, хаця пазіцыя афіцыйных улад была скіравана на павышэнне ролі ўсходняга кампанента ў культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы і культурным жыцці ўсяго краю наогул.

Нярэдка сінтэз меў даволі складаны характар, калі пры захаванні ўнутранай сюжэтнай адпаведнасці ўсходняй традыцыі тэхніка выканання таго ці іншага твора мела заходні характар і наадварот (напісанне ікон на традыцыйныя ўсходнія сюжэты алеем на палатне, а не тэмпернымі фарбамі на дошках; суправаджэнне традыцыйнага набажэнства інструментальнай музыкай; адаптацыя лацінскіх культаў да царкоўнаславянскай гімнаграфічнай традыцыі і інш.). Вельмі выразна сінтэз уплываў Усходу і Захаду праявіўся ў моўнай сферы: актыўнае пранікненне паланізмаў у царкоўнаславянскія тэксты, стварэнне твораў на некалькіх мовах адразу, напісанне беларускамоўных і царкоўнаславянскіх тэкстаў у XVII–XVIII стст. пры дапамозе лацінскай графікі і інш. Такім чынам, сінтэз усходніх і заходніх традыцый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы меў не выпадковы ці часовы характар, а з'яўляўся адным з асноўных прынцыпаў, якімі вызначалася дзейнасць царквы. Пры гэтым базісам, асновай, на якой трымалася культуратворчая дзейнасць грэка-каталіцкай царквы, былі традыцыі ўсходняга хрысціянства, а заходнія ўплывы заўжды ўспрымаліся як навацыі.

У главе 3 ***"Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў сучасным сацыякультурным працэсе ў Беларусі"*** разглядаюцца пытанні захавання, выкарыстання і вывучэння культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў XIX–пачатку XXI ст., а таксама перспектывы і праблемы яе эфектыўнага выкарыстання на сучасным этапе сацыякультурнага развіцця Беларусі.

У раздзеле 3.1 *"Захаванне, выкарыстанне і вывучэнне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў XIX–XX стст."* разглядаецца лёс культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі і яе сучасны стан. Не ўся спадчына царквы захавалася да нашага часу. Значная частка культурных набыткаў была знішчана войнамі, пажарамі, паводкамі і інш. Нямала помнікаў было знішчана свядома, па прычыне іх неадпаведнасці той ці іншай эпосе, ідэалогіі часу. Лёс культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы пасля ліквідацыі апошняй працягваў залежаць ад дыхатаміі "Усход – Захад", якая склалася ў беларускай культуры: пераважная большасць гэтай спадчыны перайшла ва ўласнасць праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Новыя ўладальнікі не маглі ў поўнай меры ўспрымаць каштоўнасці грэка-каталіцкай царквы як адпаведныя ўласнай традыцыі і раўназначныя ўласным каштоўнасцям. Гэта непазбежна вяло да страт культурнай спадчыны. На наш погляд, у XIX ст. мела месца не вайна супраць спадчыны грэка-каталіцкай царквы, як сцвярджаюць многія даследчыкі, а спроба іншых канфесій



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэграваць гэту спадчыну ва ўласную сістэму каштоўнасцей. Далёка не ўсё магло быць прынятым, таму на шляху інтэграцыі і адаптацыі не абышлося без страт.

Масавае знішчэнне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы пачалося яшчэ пры існаванні царквы – у 30-я гг. XIX ст., калі быў здзейснены рэзкі адыход ад каштоўнасцей мінулых часоў. Найбольш пацярпела пасля ліквідацыі уніі нематэрыяльная спадчына грэка-каталіцкай царквы (абраднасць, музычнае мастацтва, адукацыйная сістэма і інш.), якая значна залежыць ад свайго носьбіта. Змяненне спецыфікі бытавання, частковая або поўная незапатрабаванасць матэрыяльнай спадчыны ў новых умовах таксама вялі да значнага змяншэння яе колькасці (скульптурнае ўбранства храмаў, богаслужэбная літаратура, старажытныя абразы і інш.). Пасля знікнення грэка-каталіцкай царквы з яе імкненнем да сінтэзу традыцый Усходу і Захаду месца дыялогу і сінтэзу занялі суіснаванне і канфрантацыя. Часам рэзкая ломка традыцый выклікала супраціў і нежаданне адмаўляцца ад выкарыстання старых помнікаў і звычаяў. Пэўная частка аб'ектаў культурнай спадчыны ўсё ж здолела інтэгравацца ў новых умовах і дзякуючы гэтаму захавалася да нашага часу. Зберажэнню і вывучэнню культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы спрыяла выкарыстанне яе праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі, свецкімі ўстановамі, а таксама ўзмацненне цікавасці да свайго мінулага, якое мела месца ў XIX ст. (калекцыяніраванне, стварэнне дзяржаўных, прыватных і царкоўных музеяў).

Тысячы помнікаў сакральнага мастацтва зніклі, былі знішчаны або моцна пашкоджаны ў гады Першай сусветнай вайны. У міжваенны час у жыцці Беларусі дыхатамія "Усход – Захад" выявілася ў новай форме: тэрыторыя была падзелена паміж Савецкім Саюзам і Польшчай. У БССР нямала культурных багаццяў загінула ў сувязі з палітыкай барацьбы з рэлігіяй, аднак перавод пэўнай часткі культурнай спадчыны царквы ў бібліятэчныя, музейныя, архіўныя і іншыя ўстановы часам дазваляў забяспечыць яе лепшае захаванне, вывучэнне і папулярызацыю. У міжваеннай Польшчы мелі месца масавая канфіскацыя культурных каштоўнасцей і іх вываз з тэрыторыі "ўсходніх крэсаў" у Варшаву, Кракаў і іншыя польскія гарады, а таксама знішчэнне каштоўных помнікаў падчас барацьбы з праваслаўнай царквой. У гады Другой сусветнай вайны немцы праводзілі вобыскі і рэквізіцыі ў царкоўных установах, музеях, галерэях, архівах і бібліятэках. Шматлікія будынкі храмаў разам з убранствам былі знішчаны або выкарыстоўваліся не па прызначэнню. Новая хваля барацьбы з рэлігіяй у пасляваенны час суправаджалася як знішчэннем шматлікіх помнікаў культуры, так і інтэнсіўным вывучэннем культурнай спадчыны Беларусі, яе музеефікацыяй і рэстаўрацыяй.

Прыклад помнікаў дойлідства паказвае, што значная частка культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы сёння выкарыстоўваецца праваслаўнай царквой, нямала – каталіцкай. Гэта таксама сведчыць пра сінтэз усходніх і заходніх традыцый у працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы. Нямала помнікаў належыць дзяржаўным і грамадскім установам. Вялікая іх частка ў выніку тых ці іншых падзей апынулася па-за межамі нашай краіны. Найбольшыя страты культурнай спадчыне царквы нанесены чалавечым бяспамяцтвам, адсутнасцю ўвагі да яе. Толькі ў апошні час пачалося актыўнае вывучэнне культурнай



спадчыны грэка-каталіцкай царквы, якое прывяло да сапраўднага адкрыцця вельмі значнага самабытнага пласта культурных помнікаў беларускага мінулага.

У раздзеле 3.2 *"Патэнцыял і праблемы выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь"* разгледжаны перспектыўныя напрамкі выкарыстання культурных помнікаў, якія сёння зберагаюцца ў нашай краіне. Як і ў мінулыя часы, так і сёння Беларусь знаходзіцца на перакрыжаванні між Усходам і Захадам, спрабуе кантактаваць, узаемадзейнічаць і з тым, і з другім. У дадзенай сітуацыі культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы можа быць прыкладам творчага ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх традыцый на беларускай глебе, балансавання айчыннай культуры на памежжы адзначаных культурных макрарэгіёнаў пры захаванні ўласнага аблічча. Вывучэнне гістарычнага вопыту існавання на памежжы рознабаковых культурных уплываў можа быць карысным для выпрацоўкі мадэлі развіцця беларускай дзяржавы. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы дазваляе яскрава паказаць сувязь беларускай культуры і з заходнееўрапейскай культурай, і з культурамі паўднёва- і ўсходнеславянскіх народаў.

Разуменне незалежнага характару развіцця беларускай культуры, яе адметнасці не можа не спрыяць фарміраванню ў грамадстве ўсведамлення самабытнасці беларускага шляху сацыякультурнага развіцця, паўнацэннасці і самастойнасці беларускай культуры і беларускай нацыі. У гэтым рэчышчы культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы набывае надзвычай вялікае значэнне для фарміравання ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Ва ўмовах, калі культура становіцца каштоўным таварам, сродкам развіцця нацыянальнай эканомікі, пашырэння звестак пра тую ці іншую дзяржаву, для многіх краін турызм ператварыўся ў адну з асноўных крыніц нацыянальнага даходу. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы – самабытная і непаўторная частка культурных багаццяў Беларусі, якая спалучыла элементы заходняй і ўсходняй культур, – выгодна выдзяляе нашу краіну і робіць яе прывабнай у вачах замежных і айчынных турыстаў.

Архітэктурная спадчына, якая з даўніх часоў з'яўляецца важнейшым культурным аб'ектам амаль усіх населеных пунктаў Беларусі, архітэктурнай дамінантай вёскі ці невялікага горада і нават месцам рэлігійных паломніцтваў, з'яўляецца адным з патэнцыяльных сродкаў актывізацыі культурнага жыцця населенага пункта, развіцця яго інфраструктуры, вырашэння актуальнай у вясковай мясцовасці праблемы працоўнай занятасці.

Разуменне неабходнасці захавання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы і магчымасці атрымання эканамічнага і сацыяльнага эфекту ад яе выкарыстання патрабуе правядзення шэрагу мерапрыемстваў, якія можна прадставіць у выглядзе паслядоўнасці аперацый: пошук – ідэнтыфікацыя – улік – захаванне (кансервацыя) – вывучэнне – папулярызацыя – выкарыстанне і атрыманне эканамічных і іншых вынікаў. Пытанні пошуку, ідэнтыфікацыі і ўліку культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы вырашаны толькі часткова, што ўскладняюць нявызначанасць паняційнага апарату, нераспрацаванасць гісторыі грэка-каталіцкай царквы і нявывучанасць яе культурнай спадчыны, нізкі ўзровень яе захаванасці, невялікая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасць помнікаў у айчынных зборах, недакладнасць, памылковасць і супярэчлівасць ідэнтыфікацыі канкрэтных помнікаў, неадназначнасць трактовак ролі грэка-каталіцкай царквы ў культурных працэсах XVI–XIX стст. і інш. Сярод цяжкасцей, звязаных з захаваннем канкрэтных помнікаў, неабходна адзначыць недахоп фінансавання, недастатковую інфармаванасць грамадства, недахоп вопыту ў справе кансервацыі і рэстаўрацыі адпаведных помнікаў. Значную дапамогу ў справе вывучэння і папулярызацыі культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы можа аказаць выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій. Вопыт суіскальніка ў падрыхтоўцы электронных інфармацыйных рэсурсаў дазваляе канстатаваць перспектыўнасць шырокага ўкаранення камп'ютэрных тэхналогій у працэс вывучэння, захавання, уліку і папулярызацыі культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Дыхатамія "Усход – Захад" у дачыненні да беларускай культуры разглядаецца даследчыкамі ў пяці аспектах: Еўропа і Азія; памежжа ўсходняга і заходняга хрысціянства/славянства/Еўропы; Расія і Польшча; НАТО (або Еўрапейскі Саюз) і Расія; Усход і Захад Беларусі. З іх найбольш значнымі ўяўляюцца другі і трэці аспекты. Аналіз сацыякультурнага развіцця Беларусі дазволіў пераважнай большасці сучасных айчынных даследчыкаў схіліцца да думкі пра балансаванне беларускай культуры на мяжы ўсходніх і заходніх уплываў. Такое становішча нашай краіны спрыяла фарміраванню адметнай, багатай і шматграннай культуры, у якой заходнія і ўсходнія элементы зліліся ў непадзельнае адзінства. Сацыядынаміка беларускай культуры ва ўсе часы характарызавалася ўзаемадзеяннем як з Усходам, так і з Захадам, без абсалютнага дамінавання ўплыву таго ці іншага фактару ў канкрэтны перыяд. Каштоўнасць гістарычнага вопыту Беларусі значна павышаецца ў сучасных умовах міжкультурнага дыялогу і ўсёахопнай глабалізацыі. Цеснае ўзаемадзеянне традыцый Усходу і Захаду ў рэлігійным жыцці Беларусі суправаджалася сінтэзам, адным з вынікаў якога быў шэраг спроб аб'яднаць хрысціянскія канфесіі. Перыяд найбольш актыўнай унійнай дзейнасці ў Беларусі (XIV–XVI стст.) прыпадае на час краху Візантыі, калі канстанцінопальскія патрыярхі трапілі ў залежнасць ад турэцкіх султанаў, што выклікала неабходнасць пошукаў новай аўтарытэтнай духоўнай улады. Многія царкоўныя і дзяржаўныя дзеячы ВКЛ у XIV–XVI стст. звярталіся за падтрымкай і апекай як да заходніх, так і да ўсходніх першаіерархаў. Царкоўны саюз з Рымам, які паклаў пачатак існаванню грэка-каталіцкай царквы, часта ўспрымаўся як спосаб паяднання традыцый заходняга свету з духоўнай культурай хрысціянскага Усходу. Разгляд ідэі царкоўнай уніі ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад" дазваляе зрабіць выснову пра абумоўленасць узнікнення і рэалізацыі гэтай ідэі характарам культурна-гістарычнага развіцця Беларусі [4; 9; 15; 20; 27; 32; 35; 38].

2. Культуратворчая дзейнасць грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі грунтавалася на захаванні значнай часткі культурных традыцый праваслаўя. Праблема зберажэння традыцый усходняга хрысціянства была пастаўлена пры



узнікненні грэка-каталіцкай царквы і заставалася актуальнай да канца яе існавання. Захаванне ўсходніх традыцый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы было абумоўлена выкарыстаннем спадчыны айчыннага праваслаўя і краін усходнехрысціянскага свету, запрашэннем майстроў з праваслаўных краін і прац грэка-каталіцкіх майстроў у гэтых краінах. Традыцыі ўсходняга хрысціянства ў найбольшай ступені захаваліся ў сельскім асяроддзі і сярод белага духавенства. Пацвярджэннем таго, што ўсходняя традыцыя заставалася падмуркам культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы, з'яўляецца той факт, што асноўная частка культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы пасля ліквідацыі апошняй перайшла ва ўласнасць праваслаўнай царквы і працягвала ёю выкарыстоўвацца. Пераемнасцю ад беларускай праваслаўнай царквы можна часткова патлумачыць і пранікненне заходніх навацый у культуратворчую дзейнасць грэка-каталіцкай царквы. Аднак у параўнанні з праваслаўем грэка-каталіцкая царква аказалася больш адкрытай для заходніх уплываў. Яна свядома пайшла шляхам увядзення ва ўласную практыку многіх заходніх элементаў, колькасць якіх пастаянна павялічвалася, аднак іх дамінаванне не адбывалася [2; 3; 4; 5; 6; 9; 13; 14; 15; 21; 23; 24; 25; 28; 30; 34; 37].

3. У працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкая царква ў Беларусі не выкарыстоўвала заходнія ці ўсходнія навацыі неасэнсавана і пасіўна. Іншародныя ідэі, каштоўнасці, тэхналогіі прыжываліся толькі пасля праходжання працэдуры свядомага выбару і не з'яўляліся навязанымі звонку. Прымалася далёка не ўсё, а толькі тое, што было падрыхтавана ўсім ходам уласнага развіцця. Пасля прыняцця навацыі звычайна праходзілі працэс трансфармацыі і адаптацыі ў адпаведнасці з мясцовай традыцыяй. Арыентацыя адначасова на ўсходнія і заходнія традыцыі дазволіла грэка-каталіцкай царкве, з аднаго боку, у высокай ступені супрацьстаяць паланізацыі і русіфікацыі, а з іншага, спрыяла сінтэзу традыцый, што суправаджалася стварэннем новых форм і абумовіла самабытны і непаўторны характар культурнай спадчыны царквы. Асобныя навацыі мелі характар адкрыцця і першынства ў сусветным маштабе. Сінтэз праявіўся ў дэміфалагізацыі сакральных вобразаў, фалькларызацыі грэка-каталіцкага мастацтва, фарміраванні новай мастацкай стылістыкі, сюжэтнай і моўнай разнастайнасці твораў грэка-каталіцкага мастацтва і інш. [2; 3; 5; 6; 9; 13; 15; 18; 20; 24; 25; 27; 28; 30; 37].

4. Сінтэз традыцый Усходу і Захаду, які меў месца ў працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы, не быў у такой ступені ўласцівым іншым канфесіям у Беларусі. Частковае непрыняцце каштоўнасцей грэка-каталіцкай царквы вяло да пэўнай незапатрабаванасці і, як вынік, страт яе культурнай спадчыны. Адпаведна далёка не ўсё з таго, што было створана грэка-каталіцкай царквой у Беларусі, захавалася да нашага часу. Да таго ж шмат культурных набыткаў было знішчана пажарамі, паводкамі і іншымі стыхіямі, загінула ў войнах. Аднак і сёння культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы уражвае даследчыкаў сваім багаццем і разнастайнасцю. У сувязі з гэтым пачынаецца больш актыўнае яе вывучэнне, прымаюцца захады па яе захаванню і папулярызацыі [1; 3; 5; 6; 7; 8; 9; 10; 11; 12; 14; 15; 16; 17; 22; 25; 30; 31; 36].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. У сучасных умовах культурная спадчына становіцца адным з асноўных рэсурсаў устойлівага развіцця мацнейшых краін свету. У адпаведнасці з тэорыяй камадыфікацыі, культурныя рэсурсы ператвараюцца ў адзін з асноўных тавараў ці прадуктаў, рацыянальнае выкарыстанне якіх дазваляе істотна павысіць узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы можа быць выкарыстана і ўжо паспяхова выкарыстоўваецца для вырашэння ідэолага-палітычных, выхаваўчых і эканамічных задач. Вывучэнне гістарычнага вопыту існавання на памежжы рознабаковых культурных уплываў можа быць карысным для выпрацоўкі мадэлі развіцця маладой беларускай дзяржавы. Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы здольна зацікавіць не толькі айчынных, але і замежных даследчыкаў і турыстаў. Яе плённае выкарыстанне спрыяе больш паспяховай рэалізацыі многіх дзяржаўных праграм (як, напрыклад, праграмы развіцця вёскі). Для паўнацэннага выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі неабходна правядзенне комплексных мерапрыемстваў па яе выяўленні, ідэнтыфікацыі, уліку, захаванні (кансервацыі), даследаванні і папулярызацыі [5; 6; 8; 11; 16; 19; 20; 26; 29; 33].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Даследаванне культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі адлюстроўвае характэрныя рысы дыхатаміі "Усход – Захад" у беларускай культуры і паглыбляе разуменне сутнасці культурных працэсаў, якія на працягу некалькіх стагоддзяў мелі месца ў развіцці беларускага грамадства, акцэнтуе ўвагу на пытаннях ролі культурнай спадчыны ў выхаванні маладога пакалення, фарміраванні ў грамадзян Беларусі нацыянальнай ідэнтычнасці, гонару за ўласныя культурныя набыткі і дасягненні свайго народа.

Непасрэдная практычная каштоўнасць матэрыялаў даследавання забяспечана магчымасцю іх выкарыстання ў падрыхтоўцы і выкладанні культуралагічных, гістарычных, мастацтвазнаўчых, філалагічных і іншых вучэбных курсаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў (акты аб укараненні). Сваё прымяненне вынікі работы могуць знайсці ў правядзенні фундаментальных навуковых даследаванняў гісторыі айчыннай культуры, пры вырашэнні праблем выкарыстання культурнай спадчыны ва ўмовах сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі.

Эканамічнае значэнне дысертацыйнага даследавання грунтуецца на садзейнічанні больш эфектыўнай, дакладнай і хуткай рабоце па ідэнтыфікацыі, уліку і апісанню канкрэтных аб'ектаў культурнай спадчыны, якая праводзіцца ва ўстановах культуры рэспублікі (бібліятэках, архівах, музеях) (акт аб укараненні). Эканамічны эфект мае таксама абгрунтаванне самабытнага характару культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі, што дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць яе ў турыстычнай дзейнасці, рэалізацыі дзяржаўных праграм сацыякультурнага развіцця. Як паказвае вопыт суіскальніка [39; 40], дадатковыя эканамічныя вынікі могуць быць атрыманы пры тыражыраванні ў якасці камерцыйных прадуктаў электронных і друкаваных выданняў, якія ўзнаўляюць найбольш каштоўныя помнікі (літаратурныя, музычныя і інш.) (акт аб укараненні).



## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

**Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых часопісах**


1. Суша, А. А. Судьба культурного наследия христианства на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны / А. А. Суша // Вестник молодежного научного общества : право, экономика, культура. – 2004. – № 3 (20). – С. 48–49.

2. Суша, А. А. Адукацыйная дзейнасць грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад" / А. А. Суша // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2008. – № 10. – С. 11–17.

3. Суша, А.А. Книжкова спадщина Ігнатія Кульчинського / А.А. Суша // Вісник Львівського університету, Серія книгознавство, бібліотекознавство та інфорційні технології. – Львів, 2008. – Вип. 3. – С. 45–64.

4. Суша, А. А. Да пытання перыядызацыі гісторыі культуры Беларусі ў кантэксце яе развіцця на памежжы "Усход – Захад" / А. А. Суша // Чалавек. Грамадства. Свет. – 2008. – № 4. – С. 3–12.

5. Суша, А. А. Лёс культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі : новыя знаходкі ў львоўскіх зборах / А. А. Суша // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; склад.: Л. Г. Кірухіна, К. В. Суша. – Мінск, 2009. – Вып. 11. – С. 88–130.

6. Суша, А. А. Ля вытокаў беларускай гістарычнай навукі : творчая спадчына Ігната Кульчынскага / А. А. Суша // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 2. – С. 27–37, 2-4 с. вокл.


**Навуковая брашура**


7. Суша, А. А. Даведнік па Беларусі для імператрыцы = Путеводитель по Беларуси для императрицы = A guide to Belarus for the Empress / А. А. Суша ; Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2009. – 67 с.


**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**


8. Суша, А. А. Праблемы захавання помнікаў культавага дойлідства Гомельшчыны / А. А. Суша // Матэрыялы міжнар. навук. канф. "Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся", Гомель, 20–21 мая 2004 г. – Гомель, 2004. – С. 43–46.

9. Суша, А. А. Супрасльскі манастыр у беларускай культуры / А. А. Суша // IX Респ. науч. конф. студентов и аспирантов Республики Беларусь «НИРС–2004» : тезисы докладов : в 8 ч. – Гродно, 2004. – Ч. 4 / под ред. А. И. Жука. – С. 214–215.

10. Суша, А. А. Рэпрэсіўныя дзеянні нямецкіх акупацыйных улад супраць хрысціянскіх цэркваў Беларусі / А. А. Суша // Беларусь в годы Великой




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Отечественной войны : уроки истории и современность : материалы междунар. науч. конф., Минск, 29–30 июня 2004 г. / сост.: А. М. Литвин [и др.]. – Минск, 2004. – С. 189–191.

11.Суша, А. А. Лёс культурных каштоўнасцей Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны : праблемы вяртання / А. А. Суша // Нацыянальная спадчына і сучасныя праблемы культуры (прысвячаецца 60–годдзю вызвалення Беларусі) : даклады, прачытаныя на XXIX канф. студэнтаў і аспірантаў БДУ культуры, Мінск, 22–23 красавіка 2004 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 449–462. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 01.07.2004, № Д200471.

12.Суша, А. А. Лёс культурнай спадчыны уніяцкай царквы ў Беларусі ў складзе Расійскай імперыі / А. А. Суша // Романовские чтения : сб. трудов междунар. науч. конф. / под ред. О. В. Дьяченко. – Могилев, 2005. – С. 394–397.

13.Суша, А. А. Царкоўнаславянская мова ва ўжытку уніяцкай царквы / А. А. Суша // Мовы Вялікага княства Літоўскага : матэрыялы IV міжнар. навук. канф., Брэст, 18–19 мая 2004 г. / Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна [і інш.]. – Брэст, 2005. – С. 31–33.

14.Суша, А. А. Уніяцкія храмы і манастыры Полацка ў XVII ст. / А. А. Суша // Сімяон Полацкі : светапогляд, грамадска-паліт. і літ. дзейнасць : матэрыялы II міжнар. навук. канф., Полацк, 18–19 лістап. 2004 г. – Полацк, 2005. – С. 96–105.

15.Суша, А. А. Гісторыя хрысціянства ў Беларусі ў святле змен асабовых уласных імён / А. А. Суша // Национально-культурный компонент в тексте и языке : материалы докл. III междунар. науч. конф. под эгидой МАПРЯЛ, Минск, 7–9 апр. 2005 г. : в 3 ч. / отв. ред.: А. В. Зубов, С. М. Прохорова. – Минск, 2005. – Ч. 3. – С. 26–27.

16.Суша, А. А. Міжнародная дзейнасць Беларусі па пытаннях рэстытуцыі культурнай спадчыны / А. А. Суша // Содружество наук. Барановичи–2005 : материалы междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февр. 2005 г. : в 2 ч. / редкол.: В. И. Кочурко (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2005. – Ч. 1. – С. 235–237.

17.Суша, А. А. Акупацыйныя ўлады і хрысціянскія цэрквы / А. А. Суша // X Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 147–152.

18.Суша, А. А. Уплыў уніі на этнічную самасвядомасць беларусаў / А. А. Суша // Человек. Культура. Общество : тез. докл. I Междунар. науч. конф. студентов и аспирантов, Минск, 21–22 мая 2004 г. / редкол.: А. И. Зеленков, А. А. Легчилин (отв. ред.), Н. В. Курилович. – Минск, 2005. – С. 12–15.

19.Суша, А. А. Змест і сутнасць паняцця "культурная спадчына" / А. А. Суша // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 2005 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 139–144.



20.Суша, А. А. Узаемадзеянне ўсходняй і заходняй традыцый у беларускай культуры / А. А. Суша // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : материалы междунар. науч. конф., Гродно, 8–9 декабря 2005 г. / отв. ред. М. А. Можейко. – Гродно, 2006. – С. 440–444.

21.Суша, А. А. Беларускі гісторык у XVIII стагоддзі (на прыкладзе І. Кульчынскага) / А. А. Суша // Асоба ў гісторыі : гераічнае і трагічнае : матэрыялы II міжнар. навук.-практ. канф. студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, прысвечанай памяці прафесара У. У. Мелішкевіча, Брэст, 12–13 лістапада 2004 г. / Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст, 2006. – С. 101–106.

22.Суша, А. А. Дзейнасць Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па падліку ўрону, нанесенага культурнай спадчыне Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / А. А. Суша // Великая Победа : героизм и подвиг народов : материалы междунар. науч. конф., Минск, 28–29 апреля 2005 г. / Ин-т истории НАН Беларуси ; редкол.: А. М. Литвин (отв. ред.), А. А. Коваленя. – Минск, 2006. – С. 135–139.

23.Суша, А. А. Использование церковнославянского языка греко-католической церковью в Беларуси (1596–1839 гг.) / А. А. Суша // Ставайки съвременна наука – 2007 : материали за V международна научна практична конференция, София, 1–15 октомври 2007 г. – София, 2007. – Т. 6. – С. 59–64.

24.Суша, А. А. "Specimen Ecclesiae Ruthenicae..." Ігната Кульчынскага – адно з першых падсумаванняў гісторыі хрысціянства ў Беларусі / А. А. Суша // Библиотеки в информационном пространстве : синтез традиций и инноваций : материалы Междун. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 12 сент. 2007 г. / НАН Беларуси, ЦНБ им. Я. Коласа, Белорусская библ. ассоциация ; редкол.: Л. А. Авгуль [и др.]. – Минск, 2007. – С. 210–217.

25.Суша, А. А. Адлюстраванне культурнай спадчыны хрысціянскіх канфесій у Беларусі ў працах расійскіх падарожнікаў канца XVIII – пачатку XIX ст. [Электронны рэсурс] / А. А. Суша // Белорусский текст : от рукописи к эл. книге : материалы междунар. электронной конф., Москва, сентябрь 2008 г. / Ин-т славяноведения РАН, НАН Беларуси, ЦНБ им. Я. Коласа ; оргкомитет: Н. Ю. Березкина [и др.]. – М., 2008. – Рэжым доступу: http://www.belrus-seminar2008.narod.ru/Susha_A.A..htm. – Дата доступу: 11.09.2008.

26.Суша, А. А. Выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій для папулярызацыі літаратурнай і моўнай спадчыны Беларусі (на прыкладзе электроннага рэсурса "Шэдэўры літаратурнай спадчыны Беларусі") / А. А. Суша // Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 крас. 2008 г. / Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. Купалы НАН Беларусі ; навук. рэд.: Л. П. Кунцэвіч, Н. В. Паляшчук. – Мінск, 2008. – С. 71–76.

27.Суша, А. А. Культура Беларусі часоў Рэчы Паспалітай на памежжы ўплываў Усходу і Захаду / А. А. Суша // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья : материалы междунар. науч.-теорет. конф., Витебск, 19–20 апреля 2007 г. : в 2 ч. – Витебск, 2007. – Ч. 1. – С. 346–348.

28.Суша, А. А. Культуротворческая деятельность греко-католической церкви в Беларуси в контексте дихотомии «Восток – Запад» : значение восточного фактора / А. А. Суша // Межрелигиозные и межкультурные коммуникации в глобализирующемся мире : материалы Междунар. научно-практич. интернет-конф., Волгоград, 20–22 октября 2008 г. / Мин-во образования и науки Рос. Федерации, Волгоград. гос. ун-т. – Волгоград, 2008. – С. 186–191.

29.Суша, А. А. Роля сучасных інфармацыйных тэхналогій у вывучэнні і папулярызацыі кніжнай спадчыны Беларусі (на прыкладзе электронных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) / А. А. Суша, К. В. Суша // Матэрыялы IV Міжнар. кнігазнаўчых чытанняў "Новыя тэхналогіі ў захаванні дакументальных помнікаў", Мінск, 20–21 лістап. 2008 г. / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2008. – С. 162–167.

30.Суша, А. А. Труды русских путешественников конца XVIII – начала XIX в. как источник для изучения культурного наследия христианских конфессий в Беларуси / А. А. Суша // Книга – источник культуры : проблемы и методы исследования : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 25–27 нояб. 2008 г. / Международная ассоциация академий наук, Совет по книгоизданию, НАН Беларуси, РАН. – М. ; Минск, 2008. – С. 320–324.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

31.Суша, А. А. Лёс культурнай спадчыны Магілёўшчыны ў адлюстраванні беларускіх летапісаў і хронік / А. А. Суша // Шляхі Магілёўскай гісторыі : зб. навук. прац / уклад.: І. А. Пушкін, В. В. Юдзін. – Магілёў, 2005. – С. 59–64.

32.Суша, А. А. Дыялог "Усход – Захад" у гісторыі хрысціянства ў Беларусі / А. А. Суша // Религия и общество : актуальные проблемы современного религиоведения : сб. науч. трудов / под общ. ред. В. В. Старостенко. – Могилев, 2006. – С. 258–261.

33.Суша, А. А. Праблемы ідэнтыфікацыі і ўліку кніжнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі / А. А. Суша // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; склад.: Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мінск, 2006. – Вып. 8. – С. 44–71.



34.Суша, А. А. "Signum magnum apparuit in Caelo..." (творчая спадчына І. Кульчынскага) / А. А. Суша // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. артыкулаў : у 2 ч. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк. – Мінск, 2006. – Ч. 1. – С. 117–124.

35.Суша, А. А. Аб не-стварэнні грэка-каталіцкай царквы ў 1596 г. / А. А. Суша // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час : зб. навук. артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы ; рэдкал.: С. В. Марозава, В. У. Галубовіч, А. І. Груша. – Гродна, 2007. – С. 294–299.

36.Суша, А. А. Даведнік па Беларусі для імператарскай асобы («Топографическия примечании на знатнейшия места путешествия Ея Императорскаго Величества в Белорусския Наместничества. 1780») / А. А. Суша // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; склад.: Л. Г. Кірухіна, К. В. Суша. – Мінск, 2007. – Вып. 10. – С. 49–80.

37.Суша, А. А. Рымскія выданні Ігната Кульчынскага / А. А. Суша // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; склад.: Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мінск, 2007. – Вып. 9. – С. 47–78.

38.Суша, А. А. Дзейнасць мітрапаліта Рыгора Цамблака па дасягненню міжканфесійнага паразумення ў ВКЛ / А. А. Суша // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. артыкулаў / Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы, Ін-т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал.: С. В. Марозава, Э. С. Ярмусік, С. У. Сілава. – Гродна, 2008. – С. 73–77.

**Складанне выданняў**

39.Кніга Беларусі, 1517–1917 : зводны каталог [Электронны рэсурс] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі, НДА кнігазнаўства ; склад. каталога: Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч ; склад. электрон. выд.: Г. У. Кірэева, А. А. Суша, К. В. Языковіч ; адказны рэдактар Г. У. Кірэева. – Электрон. тэкставыя, граф. даныя і прагр. (196 Мбайт). – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2006. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM) ; 12 см. – Сістэм. патрабаванні: Intel Pentium 333; Windows 95; RAM 128; SVGA; 32x CD-ROM.

40.Шэдэўры літаратурнай спадчыны Беларусі [Электронны рэсурс] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад.: І. І. Зайцаў, В. П. Русак, А. А. Суша. – Электрон. тэкставыя, граф., аўдыёдан. і прагр. (256 Мб). – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2007. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM). – Сістэм. патрабаванні: Intel Pentium 333; Windows 98; RAM 128; SVGA; CD-ROM 32x speed; Netscape Navigator 5 або MS Explorer 5.0.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЕ

**Суша Аляксандр Аляксандравіч**

**Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі “Усход – Захад”**

Ключавыя словы: культурная спадчына, помнікі культуры, культуратворчая дзейнасць, дынаміка культуры, сінтэз, грэка-каталіцкая царква, праваслаўе, каталіцтва, традыцыі, цывілізацыя, міжкультурнае ўзаемадзеянне, Усход, Захад.

Мэта даследавання: выяўленне асаблівасцей фарміравання і выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў кантэксце дыхатаміі “Усход - Захад” у культуры Беларусі.

Метады даследавання: метадалагічную аснову даследавання складаюць канцэптуальныя палажэнні сістэмнага, гістарычнага і сінергетычнага падыходаў, прапанаваных М. С. Каганам для вывучэння праблемы “Усход – Захад”; метады: структурна-функцыянальнага аналізу, гісторыка-тэарэтычнай рэканструкцыі, кампаратыўны, абстрагавання і абагульнення.

Навуковыя вынікі і навізна заключаюцца ў наступным:

– абгрунтавана абумоўленасць узнікнення грэка-каталіцкай царквы спецыфікай міжкультурных узаемадзеянняў у Беларусі;

– выяўлены асноўныя фактары, якія ўплывалі на захаванне ўсходняга пачатку і пашырэнне заходніх навацый у культуратворчай дзейнасці грэка-каталіцкай царквы;

– вызначаны асаблівасці ўзаемадзеяння ўсходніх і заходніх уплываў у працэсе фарміравання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы;

– раскрыты важнейшыя прычыны знікнення вялікай часткі культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў XIX–XX стст.;

– выяўлены перспектыўныя напрамкі выкарыстання культурнай спадчыны грэка-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь.

Рэкамендацыі па выкарыстанню. Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца ў лекцыйных курсах у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах Рэспублікі Беларусь; у працэсе навуковага апісання старадрукаваных выданняў і рукапісаў, пры падрыхтоўцы выставак і стварэнні інфармацыйнай прадукцыі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для вырашэння ідэолага-палітычных, выхаваўчых і эканамічных задач, развіцця турызму.

Галіна выкарыстання: культуралогія, мастацтвазнаўства, краязнаўства, турызм, дзяржаўнае кіраванне сферай культуры.



## РЕЗЮМЕ

**Суша Александр Александрович**

**Культурное наследие греко-католической церкви в Беларуси в контексте дихотомии «Восток – Запад»**

Ключевые слова: культурное наследие, памятники культуры, культуротворческая деятельность, динамика культуры, синтез, греко-католическая церковь, православие, католичество, традиции, цивилизация, межкультурное взаимодействие, Восток, Запад.

Цель исследования: выявление особенностей формирования и использования культурного наследия греко-католической церкви в контексте дихотомии «Восток – Запад» в культуре Беларуси.

Методы исследования: методологическую базу исследования составляют концептуальные положения системного, исторического и синергетического подходов, предложенных М. С. Каганом для изучения проблемы «Восток – Запад»; методы: структурно-функционального анализа, историко-теоретической реконструкции, компаративный, абстрагирования и обобщения.

Научные итоги и новизна заключаются в следующем:

– обоснована обусловленность возникновения греко-католической церкви спецификой межкультурных взаимодействий в Беларуси;

– выявлены основные факторы, которые влияли на сохранение восточного начала и расширение западных новаций в культуротворческой деятельности греко-католической церкви;

– определены особенности взаимодействия восточного и западного влияний в процессе формирования культурного наследия греко-католической церкви;

– раскрыты наиболее важные причины исчезновения значительной части культурного наследия греко-католической церкви в XIX–XX вв.;

– выявлены перспективные направления использования культурного наследия греко-католической церкви в Республике Беларусь.

Рекомендации по использованию. Материалы исследования используются в лекционных курсах в высших и средних учебных заведениях Республики Беларусь; в процессе научного описания старопечатных изданий и рукописей, при подготовке выставок и создании информационной продукции в Национальной библиотеке Беларуси. Результаты исследования могут быть использованы для решения идеолого-политических, воспитательных и экономических задач, развития туризма.

Область применения: культурология, искусствоведение, краеведение, туризм, государственное управление сферой культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Aliaksandr Susha**

**The cultural heritage of the Greek-Catholic Church in Belarus in the context of the "East – West" dichotomy**

Keywords: cultural heritage, cultural monuments, culture-creating activity, culture dynamics, synthesis, the Greek-Catholic Church, Orthodoxy, Catholicism, traditions, civilization, intercultural cooperation, East, West.

Research goal: to identify the features of forming and use of the Greek-Catholic Church's cultural heritage in the context of the "East - West" dichotomy in the culture of Belarus.

Methods: the research methodological basis consists in conceptual principles of the system, historical and synergetic approaches proposed by M. Kagan for studying the "East – West" problem; methods: structural-functional analysis, historical and theoretical reconstruction, comparative method, abstraction and generalization.

Scientific results and novelty consist in:

– the conditionality of the Greek Catholic Church's origin by the specificity of cross-cultural interactions in Belarus is proved;

– the main factors that influenced on Eastern beginnings preservation and Western innovations expansion in culture-creating activity of the Greek-Catholic Church are discovered;

– features of the Eastern and Western influences interaction in the forming of the Greek-Catholic Church's cultural heritage are defined;

– the most important reasons for the disappearance of a large part of the Greek-Catholic Church's cultural heritage in the 19th and 20th centuries are revealed;

– the perspective directions of the Greek-Catholic Church's cultural heritage use in the Republic of Belarus are identified.

Recommendation on the use. The research materials are used in the lecture courses of high and secondary schools in the Republic of Belarus; in the early printed books and manuscripts scientific description, exhibitions preparation and information products creation in the National Library of Belarus. The study results can be used to solve ideological, educational and economic tasks and in tourism development.

Sphere of use: culture studies, art history, study of local lore, tourism, culture government.





Навуковае выданне

**Суша Аляксандр Аляксандравіч**

**Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі "Усход – Захад"**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

---

Падпісана ў друк 15.10.2009. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая № 1. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,43. Заказ № 323. Тыраж 60 экз.

---

Надрукавана на рызографе
УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ